/*Лагатып*/ Мінскводаканал

**ПАЛІТЫКА**

у галіне аховы працы па забеспячэнні спажыўцоў паслугамі водазабеспячэння, водаадвядзення і ачысткі сцёкавых вод

Камунальнае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства "Мінскводаканал" (УП "Мінскводаканал")

Кіраўніцтва і калектыў УП "Мінскводаканал",

усведамляючы адказнасць за жыццё і здароўе сваіх работнікаў, клапоцячыся пра павышэнне бяспекі і якасці ўмоў, бяруць на сябе абавязкі:

1. Выконваць заканадаўчыя і іншыя патрабаванні ў галіне аховы працы, прамысловай бяспекі, вытворчай санітарыі і гігіены, пажарнай бяспекі, якія дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь і распаўсюджваюцца на дзейнасць УП "Мінскводаканал".

2. Падтрымліваць прыярытэт жыцця і здароўя работнікаў у адносінах да вынікаў вытворчай дзейнасці, рэгулярна вызначаць і аналізаваць рызыкі, звязаныя з дзейнасцю персаналу, прадастаўляць бяспечныя ўмовы працы, папярэджваць няшчасныя выпадкі на вытворчасці і прафесійныя захворванні, траўмы і пагаршэнне здароўя работнікаў, прадпрымаць меры і выдзяляць неабходныя сродкі для мінімізацыі і кіравання рызыкамі зніжэння ўздзеяння небяспечных і шкодных вытворчых фактараў на працоўных месцах.

3. Пастаянна ўдасканальваць тэхналагічныя працэсы на аснове ўкаранення бяспечных тэхналогій, прымянення сучаснага абсталявання, сродкаў аўтаматызаванага кантролю і кіравання, а таксама мадэрнізацыі наяўнага абсталявання, забяспечваючы тым самым паляпшэнне ўмоў працы і павышэнне ўзроўню яе бяспекі.

4. Павышаць дасведчанасць і кампетэнтнасць, фармаваць асабістую адказнасць кожнага работніка за сваю бяспеку на аснове ўключэння работнікаў у працэс кіравання аховай працы, пастаяннага навучання, удасканалення сістэмы матывацыі персаналу.

5. Забяспечваць удзел работнікаў у дзейнасці па ахове працы, узаемадзейнічаць і супрацоўнічаць з прафсаюзным камітэтам УП "Мінскводаканал" пры фарміраванні і рэалізацыі Палітыкі ў галіне аховы працы, у поўным аб'ёме выконваць палажэнні калектыўнай дамовы.

6. Кантраляваць і аналізаваць функцыянаванне сістэмы кіравання аховай працы і стану аховы працы, своечасова прымаць кіраўніцкія рашэнні па ўдасканаленні сістэмы кіравання аховай працы, рэалізуючы прынцып пастаяннага паляпшэння і павышэння рэзультатыўнасці.

Вышэйшае кіраўніцтва УП "Мінскводаканал" прымае на сябе адказнасць за рэалізацыю дадзенай Палітыкі, забеспячэнне рэсурсамі сістэмы кіравання аховай працы і заклікае ўсіх работнікаў да выканання палажэнняў дадзенай Палітыкі.

Дырэктар /*подпіс*/ А.А.Аўруцін

"01" лістапада 2016 г.